PATVIRTINTA
Nacionalinės švietimo agentūros direktoriaus
2025 m. vasario 28 d. įsakymu Nr. VK-155

**2024–2025 M. M. 8 KLASIŲ BALTARUSIŲ GIMTOSIOS KALBOS IR LITERATŪROS (SKAITYMO) NACIONALINIO MOKINIŲ PASIEKIMŲ PATIKRINIMO ELEKTRONINIŲ UŽDUOČIŲ MOKINIŲ DARBŲ VERTINIMO INSTRUKCIJA**

| Klausimo Nr. | Atsakymas | Vertinimo kriterijai | Taškai |
|---|---|---|---|
| **I DALIS<br>KLAUSOMO TEKSTO SUPRATIMAS (8 TAŠKAI)** | | | |
| 1. | драматург<br>сцэнарыст | 1 taškas už teisingą atsakymą. | 1 |
| 2. | першы летапіс на ўсходнеславянскіх землях | 1 taškas už teisingą atsakymą. | 1 |
| 3. | князь Рагвалод | 1 taškas už teisingą atsakymą. | 1 |
| 4. | кіруючы орган старажытнага горада | 1 taškas už teisingą atsakymą. | 1 |
| 5. | Яраслаў Мудры – стваральнік першага зводу законаў<br>Ізяслаў Полацкі – патрыёт сваёй малой радзімы<br>Мсціслаў Храбры – ні ў адной бітве не быў пераможаны | 2 taškai už 3 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 2 teisingus atsakymus. | 2 |
| 6. | Да «Аповесці мінулых гадоў звяртаюцца» **пісьменнікі**, каб **узяць гістарычныя вобразы для стварэння літаратурных твораў** | Po 1 tašką už kiekvieną teisingą atsakymą. | 2 |
| **II DALIS<br>SKAITOMO TEKSTO SUPRATIMAS (16 TAŠKŲ)** | | | |
| 7. | на святых грудах | 1 taškas už teisingą atsakymą. | 1 |
| 8. | прыносілі ахвяры суровым багам | 1 taškas už teisingą atsakymą. | 1 |

<table>
<tr><td>9.</td><td>Метафары – сон перад вачамі стаіць, маланка спаліць, імя будзе жыць у стагоддзях<br>Эпітэты – багатая гісторыя, трывожны сон, агністы вянок</td><td>2 taškai už 6 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 4 teisingus atsakymus.<br>0 taškų už 2 teisingus atsakymus.</td><td>2</td></tr>
<tr><td>10.</td><td>Праўдзівае<br>- у старажытнасці людзі сяліліся непадалёк ад пясчаных выспаў<br>- навокал выспаў паслелішчы паступова рабіліся ўсё буйнейшымі<br>- груды вакол выспаў не засяляліся<br><br>Ілжывае<br>- на грудах старажытныя людзі будавалі свае сялібы<br>- на груды людзі заходзілі па любой патрэбе<br>- мясцовыя жыхары ўсё рабілі не так, як ім перадавалі іх продкі</td><td>2 taškai už 6 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 4 teisingus atsakymus.<br>0 taškų už 2 teisingus atsakymus.</td><td>2</td></tr>
<tr><td>11.</td><td>Пачаў ён узводзіць першую будыніну на грудах.</td><td>1 taškas už teisingą atsakymą.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>12.</td><td>1. У горада Наваградка багатая гісторыя.<br>2. На месцы сённяшняга горада былі пясчаныя выспы.<br>3. Мясцовыя людзі зразумелі, што іхні куточак зямлі спадабаўся высокім багам.<br>4. Пасельшчы вакол выспаў станавіліся ўсё буйнейшымі.<br>5. Ачнуўся вяшчун, а сон перад вачамі стаіць.<br>6. З цягам часу горад пачаў называцца Новагарадок, ці Наваградак.</td><td>2 taškai už 6 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 4 teisingus atsakymus.</td><td>2</td></tr>
<tr><td>13.</td><td>Паходжанне горада Наваградка.</td><td>1 taškas už teisingą atsakymą.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>14.</td><td><table>
<tr><td>Стыль</td><td>Прыкметы стылю</td><td>Прыклады</td></tr>
<tr><td>Публіцыстычны</td><td>Ацэначнасць, надзённасць, перакананасць маўлення, разлічанага на масавага чытача</td><td>Апавяданне напісана ў 2014 годзе, загаловак адпавядае патрабаванням.</td></tr>
<tr><td>Мастацкі</td><td>Свабоднае, натуральна арганізаванае маўленне з выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў мовы</td><td>Вось агеньчык ператварыўся ў сапраўднае полымя, чалавек зачаравана глядзеў на гэту</td></tr>
</table></td><td>2 taškai už 6 teisingus atsakymus.<br>1 taškai už 4 teisingus atsakymus.<br>0 taškas už 2 teisingus atsakymus.</td><td>2</td></tr>
</table>

<table>
<tr><td></td><td><table><tr><td></td><td></td><td>незвычайную з'яву.</td></tr><tr><td>Гутарковы</td><td>Перарывістасць маўлення, дыялагічнасць, непадрыхтаванасць выказвання, эмацыянальнасць</td><td>«Дзянёк сёння будзе як на заказ. Айда, Васілёк, у лес! Можа, грыбоў напалюем?» – сказаў Антон, разбудзіўшы ўнука на досвітку.</td></tr></table></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>15.</td><td>майстраваць наканечнікі стрэлаў, праколкі, разцы, скрабкі, нажы</td><td>1 taškas už teisingą atsakymą.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>16.</td><td>край</td><td>1 taškas už teisingą atsakymą.</td><td>1</td></tr>
<tr><td>17.</td><td>дапасаванне – адзін спосаб, з учарашняй знаходкай, на гэту з'яву<br>кіраванне – трапіў у вока, затаптаў агонь, сноп іскраў<br>прымыканне – зачаравана глядзеў, раз-пораз біў, не так важна</td><td>2 taškus už 9–8 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 7–6 teisingus atsakymus.<br>0 taškų už 5–4–3–2–1 teisingą atsakymą.</td><td>2</td></tr>
<tr><td colspan="4">III DALIS<br>TEKSTO KŪRIMAS (16 TAŠKŲ)</td></tr>
<tr><td>18.</td><td>Ці ведаеце вы, як і калі ўзнікла слова валанцёр? Цікава, але спачатку ў Італіі, Вялікабрытаніі і Германіі валанцёрамі называлі салдат-добраахвотнікаў, якія <u>заклікалі</u> пад свае сцягі новых удзельнікаў бітваў. Вось толькі <u>ўтрымліваць</u> велізарнае войска не было на што, таму ўзнагародай для новых салдат былі ваенная здабыча і слава.<br>Сёння слова валанцёр, безумоўна, выклікае <u>павагу</u> да людзей, якія <u>прысвячаюць</u> сваё жыццё якой-небудзь карыснай справе. Іх называюць добраахвотнымі памочнікамі, супрацоўнікамі, асістэнтамі. Яны могуць <u>абраць</u> для сябе любую сферу: працу ў прытулках для бяздомных жывёл, збор сродкаў для цяжкахворых ці <u>падтрымку</u> няпоўных і маламаёмасных сем’яў, <u>азеляненне</u> паркаў і шмат чаго іншага. Можна быць валанцёрам пастаянна, зрабіўшы гэта неад’емнай часткай свайго жыцця, а можна тут, у гэты час, прымаць удзел у акцыі, якая сапраўды зацікавіла, і дапамагаць спантанна.</td><td>4 taškai už 8–7 teisingus atsakymus.<br>3 taškai už 6–5 teisingus atsakymus.<br>2 taškas už 4–3 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 2 teisingus atsakymus.<br>0 balų už 0–1 teisingą atsakymą.</td><td>4</td></tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Няважна, каму вы дапамагаеце. Калі ваша дзейнасць ***<u>прыносіць</u>*** душэўную цеплыню вам і таму чалавеку, той істоце, на каго яна накіравана, калі ідзе яна ад шчырага сэрца, вы — валанцёр. І вамі можна ганарыцца. | | |
| 19. | *Тыпы маўлення* — *Прыкметы*<br>* Апавяданне — *Расказваецца пра дзеянні і падзеі, што ідуць адно за адным.<br>*Апісанне — *Апісваюцца прыметы і ўласцівасці прадмета (чалавека, жывёлы і інш.).<br>*Разважанне — *Тлумачыцца, даказваецца пэўная думка; паведамляецца пра прычыны падзеі ці з'явы. | Po 1 tašką už kiekvieną teisingą atsakymą. | 3 |
| 20. | Мая любімая кніга.<br>Як родны дом уплывае на развіццё асобы.<br>Памылкі нашага выбару могуць дорага каштаваць. | Po 1 tašką už kiekvieną teisingą atsakymą. | 3 |
| 21. | Што значыць быць валанцёрам? – Трэба рабіць добрыя справы для іншых, быць міласэрным, дапамагаць, часам ахвяраваць свой час або сілы. І калі чалавек ахвяруе штосьці дзеля іншага, - значыць, ён любіць.<br><br>Як я разумею сапраўднае сяброўства – Такія людзі заўсёды дапамогуць, ніколі не здрадзяць, выратуюць з любой бяды ці проста параяць выхад са складанай сітуацыі.<br><br>Мой любімы літаратурны герой – Такі персанаж прыцягвае кожнага сваёй жыццярадаснасцю, кемлівасцю, пакідае глыбокі след у памяці, на яго мы стараемся быць падобнымі.<br><br>Што такое радзіма? – Гэта і сонца ў цябе над галавой, і паветра, якім дыхаеш, і вернасць твайго сябра. і мова. якую даў табе народ, і той шлях, якім ты ідзеш ганарова ў сваю будучыню. | 2 taškai už 4 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 2 teisingus atsakymus. | 2 |
| 22. | *Крывічы – вялікае* ***<u>аб'яднанне</u>*** *старажытных плямёнаў, якія жылі ў вярхоўях Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, на поўдні Чудскага возера.* ***<u>Назву</u>*** «крывічы» даследчыкі выводзяць па-рознаму: ад прозвішча старэйшага роду Крыва; ад слоў «крэўныя» (блізкія па крыві); ад язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва-Крывейтэ; ад перасечанай, узгорыстай мясцовасці (крывізна).<br>У крывічоў існаваў няпісаны закон: калі юнак не ведаў сваіх продкаў да ***<u>пятага</u>*** калена, ён не меў права звацца ***<u>мужчынам</u>***. Такому чалавеку не давяралі, яго маглі наогул ***<u>выгнаць</u>*** з паселішча, бо лічылася, што бяспамятны лёгка | 2 taškai už 6–5 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 4–3 teisingus atsakymus.<br>0 taškų už 2–1 teisingą atsakymą. | 2 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | робіцца ***<u>здраднікам</u>***. | | |
| 23. | Легенда – Твор фальклору аб якой-небудзь гістарычнай падзеі ці з'яве, якая падаецца і ўспрымаецца як верагодная.<br><br>Апавяданне – Невялікі празаічны твор, сюжэт якога грунтуецца на пэўным эпізодзе з жыцця аднаго (часам некалькіх) персанажаў.<br><br>Байка – Невялікі, часцей за ўсё вершаваны твор сатырычнага зместу з алегарычным сюжэтам і павучальнай канцоўкай.<br><br>Аповесць – Мастацкі твор, пераважна празаічны, у якім расказваецца пра шэраг падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі. | 2 taškai už 4 teisingus atsakymus.<br>1 taškas už 2 teisingus atsakymus. | 2 |

**Iš viso 40 taškų.**

---

**Klausomo teksto transkripcija**

Аповед, які сёння вы пачуеце, з'яўляецца вольным пераказам часткі знакамітага гістарычнага помніка - «Летапісу мінулых гадоў», першага летапісу на ўсходнеславянскіх землях.

Канешне, да гэтага помніка і сёння звяртаюцца шматлікія пісьменнікі, каб узяць гістарычныя вобразы для стварэння літаратурных твораў. Адным з такіх пісьменнікаў з'яўляецца Уладзімір Бутрамееў.

Сёння Уладзімір Бутрамееў вядомы найперш як драматург і сцэнарыст, але таксама ён з'яўляецца аўтарам кнігі «Вялікія і славутыя людзі зямлі Беларускай», якая вытрымала ўжо не адно перавыданне.

Што ж расказвае нам летапіс і з чым знаёміць нас Уладзімір Бутрамееў? Звернемся да гісторыі і паслухаем пра слаўную дачку беларускага народа.

Рагнеда, нягледзячы на яе княжацкае паходжанне, выхоўвалася ў дастаткова дэмакратычных умовах. Гэта сёння маладым дзяўчатам дазваляецца гуляць, чытаць кнігі, быць нараўне з хлопчыкамі. А раней жыццё князёўны выглядала сумным: яна павінна была працягнуць княжацкі род свайго бацькі і стаць жонкай якому-небудзь князю. Таму Рагнеда пастаянна была побач з бацькам, князем Рагвалодам, і бачыла, як ён кіраваў дзяржавай. Многія рашэнні прымаў ён толькі на вечы. Гэта быў такі кіруючы орган у гараджан Полацка. Рагвалод лічыў, што і дачка яго павінна быць выхавана ў каханні, свабодзе і не павінна быць аддадзена замуж толькі за дзяржаўныя выгоды.

Да яе пасваталіся адначасова два браты: Уладзімір, князь Ноўгарада, і Яраполк, князь з Кіева. Абодва браты былі маладыя, моцныя, са слаўных гарадоў, таму абодва былі дастаткова добрымі партыямі для Рагнеды ў якасці мужаў. Аднак Рагнеда зрабіла свой выбар у бок Яраполка і публічна заявіла пра гэта, чым вельмі моцна абразіла іншага прэтэндэнта – Уладзіміра. Князь Уладзімір быў не з тых, хто дараваў такое прыніжэнне, тым больш не хацеў цярпець гэта ад жанчыны. Ён збірае вялікае войска, асаджае горад Полацк некалькі дзён.

Але Полацк павінен быў здацца. На вачах Рагнеды Уладзімір забівае яе бацьку і двух братоў, а Рагнеду сілай забірае з сабой, каб яна стала яму жонкай. Для таго, каб яна запомніла

назаўсёды сваю непакорнасць да мужа і ніколі больш такога не рабіла, Уладзімір мяняе Рагнедзе імя. Так Рагнеда становіцца Гарыславай.

Уладзімір зноў збірае вялікае войска і з вайной ідзе ўжо на свайго брата Яраполка ў Кіеў. Перамогшы і забіўшы свайго брата, князь Уладзімір становіцца і князем Кіеўскім..

Рагнеда-Гарыслава пражывае ў Кіеве, становіцца маці шасці дзяцей Уладзіміра. Як мінімум, трое з дзяцей Рагнеды і Уладзіміра з'яўляюцца ў гісторыі дастаткова знакамітымі постацямі. Гэта Яраслаў Мудры, Мсціслаў Храбры і, канешне ж, князь Ізяслаў. Яраслаў Мудры вядомы як адзін з тых князёў, пры якім Кіеўскае княства прыйшло да вялікага росквіту. Дзейнасць па развіцці дзяржавы прывяла Яраслава Мудрага да стварэння знакамітай «Рускай праўды» - першага ў свеце закону на паўсядзённае жыццё людзей. Князь Мсціслаў Храбры быў вядомы ў гісторыі тым, што ні ў адной бітве ніколі не быў пераможаны. Ён пастаянна пашыраў землі свайго княства Чарнігаўскага (сучасны горад Чарнігаў ва Украіне) і ў хуткім часе далучыў яго да Кіеўскай зямлі, чым узмацніў яе да вялікіх памераў і багацця. Князь Ізяслаў меў такі ж свабодалюбівы характар, як і яго маці, таму быў пастаянна пры ёй.У сваіх размовах, напэўна, яна не раз расказвала яму пра дзеда Рагвалода, якім чынам загінуў ён з братамі мамы. Такімі размовамі Рагнеда распальвала любоў да малой радзімы – Полаччыны, а да бацькі Уладзіміра Ізяслаў пачаў адчуваць пагарду.